СВЯТАЯ НЯДЗЕЛЯ Ў ГАРАДЗІШЧЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мне пашчасціла трапіць у Гарадзішча менавіта ў Святую нядзелю і пазнаёміцца з некаторымі жыхарамі паселішча — тымі, хто жыве тут з нараджэння, і тымі, хто праз шмат гадоў вярнуўся на бацькоўскую зямлю.

Тамара Варанкова, у дзявоцтве Сталярова, прыехала ў вёску з Чалябінска, у які яе, чатырохгадовую малечу, з сабою забралі бацькі. І які б ні быў прыгожы Урал і Уральскія горы, радзіма паклікала жанчыну назад.

— Мае бацькі былі беларусамі, я даведалася пра гэта зусім нядаўна — з архіўных дакументаў, — сказала Тамара Варанкова. — У 1917 годзе ў Гарадзішчы і ў навакольных вёсках і хутарах праводзіўся перапіс насельніцтва, і бацькі запісаліся беларусамі.

Амаль пяць гадоў назад у вёсцы адкрылася праваслаўная царква ў гонар іконы Скорапаслушніцы. Старэйшына прыхода — Галіна Кустарова. І яшчэ яна — аўтар ідэі пабудовы храма — сказала, што царкву будавалі мае землякі — майстры з горада Мсціслава. Гарадзішчанцы вельмі задаволены якасцю працы мсціслаўскіх майстроў.

У дырэктара Гарадзішчанскага Дома культуры Вольгі Шармаковай беларуская зямля — святая. У Беларусі ў 1941 годзе загінуў яе дзед Фёдар Ваўкаў.

У вёсцы яшчэ захаваліся традыцыі велікодных гульняў. Гуляюць у біткі і качаюць фарбаваныя яйкі і дзеці, і дарослыя. Нават вясковыя пенсіянеры Уладзімір Рашатнёў і Мікалай Люзункоў кожны год у гэты дзень збіраюцца разам і дэманструюць свой спрыт качання яек па жалабку.

У гэты дзень гарадзішчанцы радуюцца вясне і сонцу. Вялікдзень для іх — сімвал адраджэння прыроды і, значыць, жыцця. Вясковы майстар на ўсе рукі Дзіна Плятнёва ўсміхаецца і сваімі прыгожымі работамі сцвярджае, што творчасць і мастацтва — таксама вечныя.

Анатоль КЛЯШЧУК.

в. Гарадзішча, Хіславіцкі раён, Смаленская вобласць, Расія.

Сур'ёзная хваля холаду

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Уначы і раніцай магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 марозу, а па ўсходзе пры праясненнях — да мінус 10 градусаў. Удзень стане толькі крышку цяплей, чакаецца ад плюс 4 да плюс 10 градусаў, а па поўдні — да 12 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі айчынных спецыялістаў, у выхадныя да нас завітаюць атмасферныя франты ад цыклона з «прапіскаю» над Скандынавіяй. Чакаецца пахмурнае з ападкамі надвор'е. Паводле прагнозаў, уначы ў суботу замаразкаў на будзе ўвогуле, але ўдзень стане зусім некамфортна. Дзмітрый Рабаў паведамляе, што ў суботу на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. Уначы і раніцай прагназуецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, удзень будуць звычайныя 4—11 цяпла. Не палепшыцца надвор'е і ў нядзелю.

Дзмітрый Рабаў адзначыў, што па доўгатэрміновых прагнозах сіноптыкаў больш цёплае надвор'е трэба чакаць толькі ў апошняй пяцідзёнцы красавіка.

Ападкі і холад стрымліваюць сяўбу яравых

Спецыялісты адзначаюць, што гэтымі днямі пагоршылася аграметэаралагічная абстаноўка ў краіне. Так, мінулыя дажджы павысілі колькасць вільгаці ў верхніх пластах глебы. У некаторых раёнах Гродзенскай вобласці і па звестках многіх метэастанцый Магілёўскай вобласці верхні 10-сантыметровы пласт глебы атрымаў статус моцнага пераўвільгатнення. Больш за ўсё плошчаў з такімі глебамі па-ранейшаму застаецца ў Віцебскай вобласці, што стрымлівае сяўбу яравых культур. Больш таго, у сувязі з паніжэннем тэмпературнага рэжыму ўскладняюцца аграметэаралагічныя ўмовы для прарастання збожжа і з'яўлення ўсходаў яравых культур, замаруджваецца развіццё азімых культур, пладовых дрэў і кустоў, адрастанне траў.

На Віцебшчыне — да 10 сантыметраў снегу

Раніца 17 красавіка стала самай снежнай на гэту дату вясны за ўсю гісторыю назіранняў у Віцебскай вобласці, паведамілі ў абласным цэнтры па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага прыроднага асяроддзя.

Напрыклад, у Віцебску вышыня снежнага покрыва склала 9 сантыметраў. Папярэдні рэкорд быў зафіксаваны ў 1983 годзе, тады ў абласным цэнтры было 7 см снегу. Сіноптыкі адзначаюць, што ў панядзелак у Віцебску можа быць пабіты і тэмпературны рэкорд. На працягу дня чакаецца толькі ад 1 да 3 градусаў цяпла. А як самы халодны дзень 17 красавіка ўвайшоў у гісторыю ў 1979 годзе з тэмпературай плюс 3,4 градуса. Самая халодная ноч адзначана ў Віцебску ў 1983 годзе, калі падмарожвала да мінус 5,3 градуса. А на гэтым тыдні сіноптыкі абяцалі нам нават і да мінус 11 градусаў...

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны

ХТО ПАДУМАЕ ПРА РЭСТАЎРАЦЫЮ?..

18 красавіка традыцыйна адзначаецца Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцін. Вядома, вялікая ўвага надаецца іх ахове і аднаўленню. Таму напярэдадні спецыялісты абмеркавалі некаторыя праблемы, якія ёсць у айчыннай рэстаўрацыі.

Загадчык аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Акадэміі навук Барыс ЛАЗУКА адзначыў:

— Мы штогод прывозім шмат унікальных прадметаў з экспедыцый. І, натуральна, паўстае пытанне іх захавання і рэстаўрацыі. Часам гэтыя рэчы трапляюць у вельмі дрэнным, мякка кажучы, тэхнічным стане. У нашым музеі працуе невялікая рэстаўрацыйная майстэрня, работа якой галоўным чынам канцэнтруецца на аднаўленні іканапісу, жывапісу. А ўвогуле ў краіне існуе даволі вялікая праблема рэстаўрацыйнай работы. Справа ў тым, што ў вядучым музеі сталіцы ёсць адпаведныя кадры, паступаюць неабходныя сродкі — там могуць выконваць гэту работу. Але як быць раённым музеям?.. Некалькі гадоў таму Нацыянальны мастацкі музей узнімаў пытанне аб тым, каб арганізаваць адпаведны рэстаўрацыйны цэнтр. Я лічу, што пэўны музей, мастацкі ці гістарычны, мог бы ўзяць на сябе работу па выкананні рэстаўрацыі. Я, напрыклад, сутыкаюся з тым, што працуюць два рэстаўратары, якія займаюцца іканапісам. Але што рабіць з тканінай, керамікай, шклом, дрэвам?.. Усе гэтыя пытанні трэба тэрмінова вырашаць... Тым больш што адпаведныя кадры рыхтуюць у Акадэміі мастацтваў і ў Універсітэце культуры.

«Звязда» ўжо неаднаразова пісала пра праблемы рэстаўрацыі і тыя захады, якія робяцца для выпраўлення сітуацыі. Так, летась на выязной сесіі Міністэрства культуры прадстаўнікі мясцовых уладаў агучвалі неабходнасць з'яўлення на месцах кваліфікаваных спецыялістаў. **Дырэктар «Белрэстаўрацыі» Уладзімір ЗМУШКА** прапаноўваў стварыць гісторыка-культурную экспертызу (рэстаўрацыйны савет). У яго маглі б уваходзіць высокакваліфікаваныя мастакі-рэстаўратары, архітэктары, іншыя спецыялісты, арганізацыі нашай краіны. Змушка гатовы быў выступіць каардынатарам гэтага працэсу.

На пытанне карэспандэнта «Звязды», ці змянілася штосьці ў падыходах да рэстаўрацыі за год, адказала **спецыяліст аддзела па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Наталля ХВІР:**

Такая кафля з рыцарам знаходзіцца ў музеі гісторыі Магілёва.

— Спецыялісты Міністэрства культуры — гэта дзяржаўныя службоўцы. Мы гатовы пэўным чынам акумуляваць тыя матэрыялы, якія будуць паступаць ад спецыялістаў, напрыклад, з Акадэміі навук. Бо на сённяшні дзень нейкіх канкрэтных прапаноў адносна стварэння рэстаўрацыйнага савета, неяк аформленых, мы не атрымлівалі.

Як бачым, ёсць прастора для захадаў у паляпшэнні якасці аднаўлення помнікаў. Справа толькі за людзьмі, гатовымі ўзяць на сябе адказнасць і зрабіць канкрэтныя крокі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. *nina@zviazda.by*

■ Непагадзь

Рэкорды ёсць, праблем — няма

Нечаканы красавіцкі снег, моцны вецер і аранжавы ўзровень небяспекі не паўплывалі на працу энергетыкаў. Нягледзячы на анамальна нізкую тэмпературу і шэраг метэаралагічных рэкордаў асноўная сетка энергасістэмы краіны годна вытрымала экзамен.

Як паведамляюць у ДВА «Белэнерга», усе пашкоджанні ў размеркавальных сетках ліквідаваліся аператыўна. Усяго з раніцы 16 па раніцу 17 красавіка намаганнямі брыгад было адноўлена энергазабеспячэнне каля 180 населеных пунктаў па ўсёй краіне (у пераважнай большасці з іх пражывае менш за 50 чалавек). «Дзякуючы своечасовай падрыхтоўцы тэхнікі, матэрыялаў і рэгулярным трэніроўкам персаналу большасць пашкоджанняў у размеркавальных сетках ліквідуецца за 1,5—2 гадзіны, пры надзвычай цяжкіх умовах надвор'я і вялікай колькасці адначасовых пашкоджанняў гэты час можа павялічвацца. Непагадзь парушыла працу ўсяго 38 ліній 6—10 кВт», — інфармуюць у вытворчым аб'яднанні.

Аналагічная сітуацыя і з надзвычайнымі здарэннямі — пра звязаныя з непагаддзю сітуацыі не паведамлялася, тое самае датычыцца і ДТЗ. Тым не менш ДАІ настойліва рэкамендуе кіроўцам, якія ўжо замянілі зімнюю гуму на летнюю, устрымацца ад паездак, асабліва ў ранішні час, калі тэмпература апускаецца ніжэй за нуль.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Здарэнне

Забраў у абменніку лішнія грошы

У сталіцы вышукваецца малады чалавек, якому касір памылкова выдала нашмат большую суму грошай, чым належала.

— Хлопец падышоў да акенца касіра філіяла банка, размешчанага ў адным з гандлёвых цэнтраў. Папрасіў абмяняць долары ЗША на беларускія рублі, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ**. — Касір выдала кліенту грашовыя сродкі на дзве тысячы рублёў больш належнай сумы. Малады чалавек забраў грошы і пайшоў. Недастача выявілася толькі праз некалькі гадзін. Служба бяспекі банка забрала запіс з камеры відэаназірання, зараз хлопца вышукваюць.

Сяргей РАСОЛЬКА